# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, АГ. ДРАЧКАВА)



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь):** 613Д000573

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, аграгарадок Драчкава, вул. Цэнтральная, на могілках

**Каардынаты:** 53.819719, 28.076277

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Драчкава Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. Помнік знаходзіцца на могілках в. Драчкава, каля дарогі. У 1965 г. на магіле пастаўлен помнік. Пахавана 80 воінаў і 1 партызан, адзін невядомы салдат, якія загінулі ў 1941–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Драчкава Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000573**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік знаходзіцца на могілках в. Драчкава, каля дарогі, у добрым стане. Вакол помніка і падыход да яго вылажаны тратуарнай пліткай. У 1965 г. на магіле пастаўлен помнік, выкананный з граніту, а абапал яго 2 пліты, на якіх выбіты імёны загінуўшых. Уверсе помніка і пліт намаляваны зоркі. На помніке выгравіраваны надпіс "Вечная слава героям павшим в боях за освобождение и независимость нашей Родины 1941–1944".

У брацкай магіле пахавана 80 воінаў і 1 партызан, адзін невядомы салдат, якія загінулі ў 1941–1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таксама, ў брацкай магіле захаваны адзін з сыноў Епісцініі Фёдараўны – Іван Сцяпанаў (1915–1943).

Іван Міхайлавіч Сцяпанаў нарадзіўся ў 1915 годзе ў станіцы Цімашэўскай Краснадарскага краю. Адзін з дзевяці сыноў сям'і Сцяпанавых, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Службу ў Чырвонай Арміі Іван Сцяпанаў пачынаў ва Украіне. Ён паспяхова скончыў Арджанікідзеўскае Чырванасцяжнае ваеннае вучылішча. Стаў камуністам.

Зімой 1940 года лейтэнант Іван Сцяпанаў удзельнічаў у баях з белафінамі. Паказаў сябе адважным і рашучым камандзірам.

Вялікая Айчынная вайна заспела яго на заходняй мяжы, у Беларусі. Пасля некалькіх дзён цяжкіх баёў полк Івана апынуўся ў асяроддзі. Савецкія воіны змагаліся з фашыстамі да апошняга патрона. Ноччу пайшлі на прарыў, але з акружэння выйшлі не ўсе. Многія загінулі, а лейтэнант Сцяпанаў, цяжка паранены, быў схоплены гітлераўцамі. Ледзь паправіўшыся – бег. Яго зноў

схапілі, жорстка збілі і кінулі за калючы дрот. Няўдачай скончыўся і другі ўцёкі. І толькі ў трэці раз ён вырваўся на волю.

Восенню 1942 года Іван Сцяпанаў дабраўся да вёскі Вялікі Лес Смалявіцкага раёна. Яго схавалі ў сям'і калгасніка сельгасартэлі «Добрая воля» П.І. Нарэйкі. Тут ён сустрэў і палюбіў дачку гаспадара Марыю.

Фашысты высачылі Івана Сцяпанава і на вачах Марыі, якая да гэтага часу чакала дзіця, расстралялі. Гэтая трагедыя адбылася ў лістападзе 1943 года.

Пахаваны Іван Міхайлавіч Сцяпанаў у брацкай магіле аграгарадка Драчкава Смалявіцкага раёна.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

3. Памяць. Беларусь : рэспубліканская кніга / С. П. Самуэль [і інш.]; пад агул. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 623 с.

4. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.

5. Карта Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nakarte.by/drachkovskiy-selsovet. – Дата доступа: 15.10.2022.